# У ДРУЖНУЮ СТУДЭНЦКУЮ СЯМ'Ю

## ФОТАРЭПАРТАЖ З ПАСВЯЧЭННЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ У СТУДЭНТЫ



Выступае прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў.



Сцяг універсітэта уносіць кавалер ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга Ф. М. Харытановіч.




Вось ён, сімвалічны білет першакурсніка.



«Ключ ведаў» у руках Алега Быкава.




Запальваецца «Чаша ведаў».



Званок кліча першакурснікаў на першую лекцыю.

Фота У. Чысціка, К. Дзміцеркі.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

| № 25 (512) | Субота, 4 верасня 1982 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап. |
|---|---|---|---|

Відавочнае пачуццё хвалявання і радасці перажылі ў першы вераснёўскі дзень 800 юнакоў і дзяўчат, якія паспяхова вытрымалі ўступныя конкурсныя экзамены і залічаны на вучобу ў вядучую навучальную ўстанову Беларускага Палесся — Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Па добрай традыцыі адбылося пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. На ўрачыстасць прыйшлі кіраўнікі ГДУ, дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, выкладчыкі, студэнты старэйшых курсаў.

Пад гукі марша сцяг універсітэта унісіць кавалер ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Ф. М. Харытановіч.

Новае папаўненне студэнцкай сям'і універсітэта цёпла вітаў прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў. Пад гарачыя апладысменты прысутных ён уручыў сімвалічны студэнцкі білет Сяргею Петрашу з фізічнага і Але Турко з эканамічнага факультэтаў.

Вядучыя паведамляюць аб тым, што група спартсменаў універсітэта запаліла факел ад Вечнага агню ў мемарыяльным скверы на плошчы Працы каля брацкай магілы загінуўшых воінаў. Ганаровае права пранесці па вуліцах горада гэты факел і запаліць ім «Чашу ведаў» было прадастаўлена прызёру III Усесаюзных маладзёжных гульняў кандыдату ў майстры спорту па лёгкай атлетыцы Сяргею Кузьмянку.

Да першакурснікаў звярталася выдатніца вучобы біялагічнага факультэта Людміла Тарарэнка. Яна заклікае першакурснікаў выдатнай вучобай, актыўнай грамадскай дзейнасцю памнажаць лепшыя традыцыі універсітэцкага калектыву і ўручае студэнту першага курса матэматычнага факультэта Алегу Быкаву «Ключ ведаў».

Ад удзельнікаў студэнцкага будаўнічага руху да першакурснікаў звярнуўся выпускнік ГДУ кавалер ордэна «Знак Пашаны» Вячаслаў Асіпенка. Як эстафету выдатных працоўных спраў, ён уручыў кельму першакурсніку Уладзіміру Буракоўскаму.

Са словамі найлепшых пажаданняў на ўсе гады студэнцкага жыцця да першакурснікаў звярнуўся сакратар камітэта ЛКСМБ універсітэта С. У. Аўсеенка.

Галіна Шульцава з эканамічнага факультэта зачытала клятву першакусніка, якую шматгалосым хорам паўтарылі ўсе навабранцы нашага універсітэта.

Нарэшце ў руках Наташы Усковай звініць першы званок. Ён кліча першакурснікаў на першую ў іх жыцці студэнцкую лекцыю. Яна адбылася ў актавай зале. З ёй выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў. Леанід Аляксандравіч расказаў аб сістэме і развіцці вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, аб умовах, якія створаны для плённай вучобы і актыўнай грамадскай дзейнасці студэнтам ГДУ. Затым першакурснікі пазнаёміліся з дэканамі, загадчыкамі вядучых кафедр, кіраўнікамі грамадскіх арганізацый універсітэта.

Наперадзе ў першакурснікаў — пяць гадоў вучобы. Няхай гэтыя гады стануць самымі яркімі і запамінальнымі ў іх жыцці.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# У ХАРЧОВУЮ ПРАГРАМУ—УКЛАД КОЖНАГА

Асаблівай вяхой пазначыцца ў гісторыі нашай сацыялістычнай Айчыны бягучы год. Ён праходзіць пад знакам дастойнай сустрэчы слаўнага 60-годдзя з дня ўтварэння СССР. Уздым палітычнага энтузіязму і працоўнай актыўнасці савецкіх людзей абумоўлены і рашэннямі вялікай дзяржаўнай важнасці, прынятымі на майскім (1982 г.) Пленуме ЦК КПСС. У іх яскрава адлюстраваліся ўзрастаючыя клопаты партыі аб няўхільным павышэнні дабрабыту працоўных, поўным забеспячэнні іх усімі неабходнымі прадуктамі харчавання.

Пастаўленыя перад сельскагаспадарчай вытворчасцю задачы даволі аб'ёмныя і складаныя. Іх паспяховае вырашэнне залежыць не толькі ад тых, хто працуе на палях і фермах. Недахоп рабочых рук, занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці, абавязвае прыйсці на дапамогу калгасам і саўгасам кожнага працаздольнага.

Характэрнай адметнасцю нашага сацыялістычнага ладу стала тое, што рабочыя і служачыя прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, студэнты і навучэнцы з пачуццём свайго патрыятычнага абавязку прыязджаюць у вёску, каб дапамагчы сельскім працаўнікам у правядзенні найбольш працаёмкіх і нескладаных работ.

Не застаецца ў баку ад агульнай справы і шматлікі калектыў нашага універсітэта. Ужо на працягу некалькіх гадоў ён шэфствуе над саўгасам «Рэчкі» Веткаўскага раёна. Для прыбываючых на працу тут створаны стацыянарны лагер. У гаспадарцы прымаюцца меры для забеспячэння ўсіх умоў, спрыяючых высокапрадукцыйнай працы. Асабліва радуюць яе вынікі сёлета. Прадстаўнікамі універсітэта для грамадскага статку нарыхтавана ўжо каля 400 тон сена, засціртавана амаль 700 тон саломы. Старанна папрацавалі шэфы і на вырошчванні гародніны.

Сваімі поспехамі па праву ганарацца студэнцкія атрады, якія прымаюць удзел у працоўных семестрах. Шмат грамат і падзяк, а галоўнае — добрая памяць ад сельскіх працаўнікоў, заслужана імі сёлета.

Па-свойму экзаменуе шэфаў восень. Гэта перыяд, калі неабходна, іншы раз пры неспрыяльных кліматычных умовах, убіраць другі беларускі хлеб — бульбу.

У працоўным семестры асенняга этапа сёлета прымуць удзел больш тысячы студэнтаў нашага універсітэта. У асноўным яны будуць працаваць у гаспадарках падшэфных Петрыкаўскага і Жыткавіцкага раёнаў, у саўгасе «Рэчкі». Гонар кожнага студэнта — з першага дня паказаць узоры стараннасці і працавітасці. Гэтаму павінна садзейнічаць шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва як індывідуальнае, так і атраднае. Яго вынікам паўсюдна неабходна надаваць шырокую галоснасць праз «маланкі», «баявыя лісткі», насценныя газеты. Аб перадавіках павінны ведаць усе. Разам з тым нельга выпускаць з поля зроку і безадказных таварышаў. Справядлівай, прынцыповай крытыкай трэба настаўляць іх на актыўную і якасную працу, падцягваць да ўзроўню перадавікоў спаборніцтва.

Уборка ўраджаю патрабуе шмат сіл. Аднак калі выпадуць вольныя гадзіны, іх трэба праводзіць разумна, з карысцю. Прапагандысцкая работа, сустрэчы са школьнікамі мясцовых школ з мэтай іх прафарыентацыі, аказанне шэфскай дапамогі ветэранам вайны і працы, выступленне агітбрыгад — гэта і многае іншае ўваходзіць у пачэсныя абавязкі кожнага сельскагаспадарчага атрада на месцы дыслакацыі. Усімі сваімі справамі трэба заслужыць прызнанне і шчырую ўдзячнасць хлебаробаў.

Рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафсаюзныя камітэты універсітэта ўпэўнены, што кожны студэнт, выкладчык і супрацоўнік ГДУ, які выедзе на сельскагаспадарчыя работы, унясе свой пасільны уклад у ажыццяўленне Харчовай праграмы, падрыхтуе дастойны працоўны падарунак 60-годдзю СССР.

# ЗАСТАЛОСЯ РАСЧАРАВАННЕ...

Колькі разоў даводзілася мне чуць, як байцы студэнцкіх атрадаў розных профіляў у сваіх расказах аб рабоце ў трэцім працоўным семестры прыгадвалі: «На развітанне нас запрашалі прыязджаць яшчэ. Нават на работу запрашалі пасля заканчэння універсітэта».

Словы гэтыя ўспомніліся мне, калі я слухала расказ камандзіра інтэрнацыянальнага студэнцкага атрада «Спадчына» Мікалая Сівенкі. Ён з роспаччу гаварыў аб тым, як цяжка прыйшлося яго атраду, як доўга помняцца тыя расчараванні, якія перажывае малады энтузіязм пры сутыкненні з валакітай, раўнадушшам, з нежаданнем рабіць сваю справу чэсна.

Атрад «Спадчына» працаваў гэтым летам у Вялікіх Луках, што ў Пскоўскай вобласці. Вялікалукскі будаўнічы камбінат абслугоўвае сельскую гаспадарку вобласці. Камбінат — шматпрофільнае аб'яднанне. Працаваць рабятам прыйшлося і на заводзе жалезабетонных канструкцый, і на бетанаванні падлогі ў рамонтна-механічным цэху. Яны заканчвалі будаўніцтва цэха керамзітавага гравію, узводзілі нулявы цыкл аднаго з вытворчых памяшканняў. Адна з брыгад атрада працавала на будаўніцтве пяці двухкватэрных жылых дамоў для калгаснікаў, праводзіла цеплатрасу да іх, будавала кацельную. Студэнты пабудавалі дарогу на тэрыторыі завода жалезабетонных канструкцый, уклалі палавіну пліт пляцоўкі пад вытворчую сыравіну. За два месяцы работы атрад з 32 чалавек асвоіў 75 тысяч рублёў капітальных укладанняў. Гэта на тысячу больш, чым прадугледжвалася дагаворам.

На працягу гэтых двух месяцаў рабяты пастаянна адчувалі, як збоі, якія ліхарадзяць прадпрыемства, адбіваюцца на рабоце і іх атрада. У прадбачанні такога варыянту кіраўніцтва камбіната адным з пунктаў дагавору прадугледзела бесперабойную пастаўку бетона для байцоў СБА. На камбінаце, напэўна, добра ведалі, што іх працу рытмічнай не назавеш, і паспрабавалі неяк засцерагчы атрад ад перабояў у рабоце. Але абавязацельства гэтае выканана не было. У рабочыя дні бетон адпускалі нават «шабашнікам», а ў выхадныя, калі не працаваў аўтамабільны транспарт, прапанавалі яго студэнтам. Вось так і ішла работа. Быў нават перыяд, пра які самі рабяты сказалі так: «канаву выкапай — закапай».

Для таго, каб неяк рэабілітаваць сябе, кіраўніцтва камбіната прапанавала перавесці 5 байцоў атрада ў фармовачны цэх завода з умовай аплаціць іх працу ў адпаведнасці з сярэднім заработкам. І гэтую ўмову на камбінаце ў Вялікіх Луках таксама не выканалі.

Але гэта адзін бок жыцця атрада «Спадчына». Быў і другі. Атрад, нягледзячы ні на што, жыў паўнакроўным студэнцкім, будатрадаўскім жыццём. Рабяты разбіліся на брыгады. У кожнай з іх, акрамя савецкіх студэнтаў, працавала і па двое замежных. Усяго ў атрадзе было восем студэнтаў з Нікарагуа і Лаоса. Яны — студэнты політэхнічнага тэхнікума, закончылі першы курс. Дзяўчына з Лаоса Нонтхавонг Кхамвай працавала з Таццянай Літвінавай і Людмілай Анацкай на афарбоўцы. Таццяна — студэнтка эканамічнага факультэта нашага універсітэта. Людміла вучыцца ў медыцынскім інстытуце ў Мінску, была атрадным урачом. Марціна Брэнеса з Нікарагуа прызначылі брыгадзірам адной з брыгад. Па руску рабяты размаўляюць не вельмі добра, але гэта не стала бар'ерам у наладжванні сяброўскіх адносін, а тым больш у зладжанай рабоце.

У выхадныя дні ездзілі ў падшэфны калгас камбіната «Змычка», дзе нарыхтавалі 12 тон сена для грамадскага статку. А пасля работы і канцэрт калгаснікам паказалі.

Дарэчы, канцэртная брыгада атрада карысталася папулярнасцю ў Вялікіх Луках. Калі ў час святкавання Дня будаўніка ішоў канцэрт для рабочых завода жалезабетонных канструкцый, да Мікалая Сівенкі падышлі прадстаўнікі будтрэста № 52 і запрасілі да сябе. Так рабяты з аднаго канцэрта паехалі прама на другі. Асабліва гучнымі былі апладысменты пасля таго, як сціхала гітара Рохаса Хенара. Ён выконваў народныя песні.

Двойчы запрашалі рабят на агітацыйныя пляцоўкі ў мікраёны Вялікіх Лук. 12 жніўня яны збіраліся выступіць на летняй эстрадзе горада, ды дождж перашкодзіў — ліў, як з вядра.

На гэтым жа камбінаце праходзілі практыку навучэнцы будаўнічага вучылішча. Пасябравалі з імі рабяты і па вечарах наладжвалі сяброўскія сустрэчы па футболу.

8 жніўня ў Вялікіх Луках адбыўся занальны фестываль СБА. Шмат было цікавага: конкурсы, спаборніцтвы... Рабяты са «Спадчыны» прынялі ўдзел у многіх з іх. У спартыўнай эстафеце яны занялі першае месца, у спаборніцтвах футбольных каманд СБА — другое.

Дапамагалі рабяты гарадскому дашкольнаму дзіцячаму дому. Зрабілі рамонт пляцовак для гульняў, пафарбавалі іх. Навялі парадак у «Казачным гарадку». Са сваёй заработнай платы пералічылі грошы на кнігі і цацкі для дзяцей.

Змястоўнай была і культурная праграма. 18 ліпеня атрад у поўным саставе адправіўся на экскурсію па пушкінскіх мясцінах: Міхайлаўскае, Пятроўскае, Святагорскі манастыр.

Па вячарах у заводскім інтэрнаце гучала музыка: студэнты наладжвалі дыскатэкі, на якія збіралася моладзь.

— Увогуле можна было б лічыць, што ўсё не так ужо і дрэнна, — гаворыць Мікалай Сівенка, — але прыкра ад пачуцця, што можна было зрабіць значна больш, што шмат часу было патрачана ўпустую. Тым больш прыкра, што мы былі не ў сілах змяніць становішча. Усе нашы спробы былі безвыніковымі. Шкада.

У час развітання студэнтаў не запрашалі прыехаць яшчэ, папрацаваць, дапамагчы ў асваенні земляў Нечарназем'я. Ды наўрад ці яны і самі яшчэ раз пажадаюць так непрадуктыўна, на іх думку, правесці свой трэці семестр.

М. КАЗАКОВА.

КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

# ПРА РАМАН НАШЫХ ДЗЁН

У святле тых спрэчак, што ідуць сёння аб рамане як жанры, аб яго жыццядзейнасці і перспектыўнасці, надзвычай актуальным уяўляецца нам зварот крытыкі і літаратуразнаўства да асэнсавання тэндэнцыяй яго развіцця. Сярод апошніх работ падобнага плана — і манаграфія Паўла Дзюбайлы «Беларускі раман».

Кніга гэтая ствабралася на працягу некалькіх год і ўвабрала ў сябе часткова ўжо знаёмыя па перыёдыцы роздумы і назіранні аўтара аб творах сучасных беларускіх празаікаў.

Дазволім сабе агаварыцца: аўтар не ставіў сваёй задачай прааналізаваць на аднолькавым узроўні ўсе выдатныя і тым болей проста радавыя з'явы сучаснай беларускай прозы. Аднак тое, што ён уключыў у кнігу, стварае ў чытача цэласнае ўяўленне аб сучасным літаратурным працэсе.

Чалавек і грамадства, чалавек і асяроддзе, характар і абставіны, выпадковае і заканамернае — усе гэтыя найбольш агульныя паняцці набываюць канкрэтнае гучанне ў працэсе літаратуразнаўчага аналізу.

Кніга адкрываецца аглядным раздзелам «Асэнсоўваючы сучаснасць». На матэрыяле раманаў І. Шамякіна «Вазьму твой боль», П. Місько «Градабой», В. Карамазава «Пушча», Л. Гаўрылкіна «Зямля дзяцей нашых», А. Кулакоўскага «Васількі» П. Дзюбайла даследуе шырокае кола пытанняў, якія датычаць ідэйна-тэматычнага і жанрава-стылявога ўзбагачэння беларускага рамана аб сучаснасці. Адну з істотных асаблівасцей творчай манеры нашых лепшых раманістаў П. Дзюбайла справядліва бачыць у іх высокай грамадзянскай актыўнасці, здольнасці да глыбокіх сацыяльна-мастацкіх, філасофскіх абагульненняў. Натуральна, даследчык імкнецца выявіць адметнасць кожнага пісьменніка як творчай індывідуальнасці.

Так, даследуючы вызначальныя якасці творчай манеры І. Шамякіна, абумоўленыя асаблівасцямі таленту пісьменніка, П. Дзюбайла бачыць іх перш за ўсё ў« канцэптуальнай пастаноўцы і вырашэнні агульназначных праблем сучаснасці», асабістай адказнасці кожнага чалавека за ўсё зробленае ім, высокай маральнасці і чалавечнасці.

Наватарства П. Місько ў рамане «Градабой» крытык бачыць ва ўзнаўленні праз побыт «шматлікіх канфліктных сітуацый, вострых чалавечых сутыкненняў, бурных перажыванняў». Адметнасць мастацкага стылю аўтара крытык выяўляе і ў моцнай сувязі з жыццём сучаснай вёскі, з прыродай, у тым глыбокім лірызме, які шмат у чым вызначае настрой герояў, іх перажыванні і светаадчуванні.

Арганічна звязаны, на думку П. Дзюбайлы, з праблемамі сучаснасці і раман В. Карамазава «Пушча», індывідуальнасць аўтара ў якім выявілася ўжо ў самім выбары тэмы. «У такіх любоўных, беражлівых адносінах да зямлі, прыроды, лесу, да таго кута, дзе чалавек нарадзіўся і вырас, — робіць вывад крытык, падагульняючы ўсё сказанае аб рамане «Пушча», — ёсць штосьці вельмі важнае і патрэбнае для сучаснага чалавека, бо з беражлівых адносін да народнай спадчыны, да «вытокаў», да роднага кута, сваёй малой бацькаўшчыны нараджаецца вялікае пачуццё Радзімы, савецкага патрыятызму...».

Слушным з'яўляецца і агульны вывад аўтара кнігі «Беларускі раман» адносна твораў аб сучаснасці, якія сёння яшчэ раз пацвердзілі, што «патрэбна арганічнае веданне і разуменне з'яў сучаснасці, сучасных эканамічных, вытворчых працэсаў, маральна - этычных праблем, сапраўдная зацікаўленасць, талент і майстэрства, каб глыбока пранікнуць у маральную аснову чалавечых узаемаадносін на вытворчасці, побыце, у інтымным жыцці, каб раскрыць сутнасць быцця нашага сучасніка».

Раздзел «Асэнсоўваючы сучаснасць» цікавы не толькі высокім прафесійным узроўнем, але і прынцыповай, патрабавальнай пазіцыяй крытыка, які не задавальняецца дасягнутым

(Заканчэнне на 4-й стар.).

—4—

Жывуць рабяты ў добрых умовах:
ім прадаставілі школьны інтэрнат. Га-
туюць для іх у саўгаснай сталоўцы тры
разы ў дзень, а тыя, хто змяняецца з
начной змены, або заступае ў ноч, па-
спявае падсілкавацца і часцей.

Наогул справы ідуць добра. Дзякую-
чы добрасумленнай працы студэнтаў і
давер'ю ў адказ з боку кіраўніцтва саў-
гаса. Цэняць рабят і ў вёсцы. Іх удар-
ная праца спачатку здзівіла мясцовых
механізатараў, потым выклікала павагу
і жаданне паспаборнічаць. У мінулым
годзе рабяты часта былі наперадзе. Сё-
лета таксама імкнуцца не адставаць ад
сваіх уласных рэкордаў. У канцы жніў-
ня дырэкцыя саўгаса пачала размову
аб тым, каб запрасіць рабят папраца-
ваць яшчэ і ў верасні. Спраў яшчэ
шмат — нарыхтоўка кармоў у поўным
разгары, а тут як раз уборка бульбы
падаспее. Адных саўгасных рабочых
не хопіць. І рабяты згаджаюцца — а
як жа не дапамагчы: амаль што роднай
стала вёска. Жанчыны спыняюць на
вуліцы: «Чулі, якія вы працавітыя. Дзя-
куй, сынкі». Пажылыя людзі, пенсіяне-
ры — таксама блізка знаёмы з молад-
дзю з Гомеля. Яшчэ на пачатку рабо-
ты рабяты знайшлі час пабываць у вы-
канкоме сельскага Савета народных
дэпутатаў, даведаліся, хто з пажылых
мае патрэбу ў дапамозе, хто з іх вая-
ваў.

Таму хлеб, які здадуць у засекі Ра-
дзімы рабочыя саўгаса, будзе і хлебам
студэнтаў ГДУ. І ўзімку, узяўшы ў ру-
кі цёплы акраец хлеба, магчыма, па-
думае хто-небудзь з рабят: «А гэта ж
і мой хлеб». І якім дарагім, якім смач-
ным пакажацца ён!

М. ШЫМАНОЎСКАЯ.

# ДАСЛЕДУЕ АГРАБІЯСТАНЦЫЯ

Харчовая праграма, якая была вызначана на XXVI з'ездзе КПСС, а затым распрацавана і прынята майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС, патрабуе значнага росту і паляпшэння якасці ўсіх відаў кармоў для грамадскай жывёлагадоўлі. Рашаючая роля ў гэтай справе належыць павелічэнню ўтрымання ў кармах бялку. Прычым, асабліва падкрэсліваецца важнасць павелічэння кармавога бялку за кошт пашырэння пасеваў і вытворчасці лубіну, люцэрны, канюшыны, гароху, соі, рапсу і іншых высокабялковых культур. Ва ўмовах нашай рэспублікі вядучай высокабялковай культурай з'яўляецца лубін. Гэта культура заняла асноўнае месца ў Беларусі, таму што 52,5 працэнта пашы ў нас складаюць глебы лёгкага механічнага саставу. «А на лёгкіх глебах, — адзначае відны польскі вучоны С. Барбацкі, — з пункту гледжання здабывання таннага бялковага корму лубін з'яўляецца раслінай, якая не мае сабе канкурэнтаў».

Гэта дасягаецца, згодна апошніх даследаванняў, дзякуючы высокай азотфіксуючай здольнасці лубіну, які сапраўды не мае сабе роўных па данаму паказчыку. Акрамя гэтага, яго каранёвая сістэма здольная кіслымі выдзяленнямі раствараць фосфарныя злучэнні глебы, якія застаюцца недаступнымі для многіх іншых культур. А магутны стрыжнявы корань, які пранікае на глыбіню 1,4—2,2 м, уяўляе сабой натуральную усмоктваючую помпу. Пры дапамозе яе харчовыя рэчывы з глыбінных пластоў глебы і падглебы перакачваюцца ў пашавыя гарызонты. Такім чынам, глебы лёгкага механічнага саставу, якія бедныя на арганічныя рэчывы, абагачаюцца.

Улічваючы ўсе ўласцівасці лубіну, становіцца зразумелай тая вялікая цікавасць, якую праяўляюць у нашай краіне да гэтай культуры. Аб гэтым жа сведчыць і высокая адзнака, якая была дадзена лубіну з трыбуны XXVI з'езда КПСС прэзідэнтам Акадэміі навук СССР акадэмікам А. П. Аляксандравым. Ён сказаў: «...Лубін за мяжой ужо назвалі «паўночнай сояй». Ён дае цудоўны ўраджай, гэта выдатны корм. Трэба яго хутчэй укараняць».

У нечарназёмным рэгіёне нашай краіны, Беларусі адводзіцца вядучае месца вытворчасці насення лубіну. У бягучай пяцігодцы рэспубліка павінна нарыхтаваць амаль палавіну — 45,2 працэнта таварнага насення гэтай культуры, у той час як паўднёва-заходні і цэнтральны эканамічныя раёны будуць нарыхтоўваць адпаведна 30,1 і 18,7 працэнта. Аднак узровень ураджайнасці яе ў цэлым па рэспубліцы застаецца невысокім. Адна з прычын — недастаткова добра пастаўленая селекцыйная работа. У сувязі з гэтым на аграбіялагічнай станцыі ГДУ «Старыя Чонкі» вядзецца работа па выдзяленню зыходнага матэрыялу для сінтэзу сартоў, якія б адказвалі патрабаванням сучаснай сельскагаспадарчай вытворчасці. Мы выдзелілі зыходны матэрыял для атрымання сартоў з ураджайнасцю зялёнай масы 500 — 600 цэнтнераў з гектара. Адначасова выдзелены зыходны матэрыял для сінтэзу сартоў жоўтага, белага лубіну на ўстойлівасць да найбольш распаўсюджаных захворванняў. Ёсць формы з высокім ўзроўнем назапашвання бялку ў насенні (45—48 працэнтаў), у кантрольных пробах — 42—43 працэнты. Мы атрымалі шэраг перспектыўных ліній жоўтага і белага лубіну. Адначасова размножваем некалькі сартоў з тым, каб перадаць іх насенне калгасам і саўгасам вобласці. Максімальная рэалізацыя на практыцы атрыманых вынікаў з'явіцца нашым укладам у выкананне Харчовай праграмы.

М. БАЙДА,
загадчык аграбіялагічнай станцыі універсітэта.

